# ТАВ. Н. Ф. ГІКАЛО НА БЮРО ЦК ЛКСМБ

Учора, 3 студзеня першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Н. Ф. ГІКАЛО** прысутнічаў на пасяджэнні бюро ЦК ЛКСМБ, якое было прысвечана падрыхтоўцы чарговага пленума ЦК ЛКСМБ і бягучым пытанням работы арганізацыі.

Тав. Гікало, прыняўшы ўдзел у абгаварэнні пытанняў пасяджэння, у сваіх выступленнях з надзвычайнай чоткасцю паставіў перад удзельнікамі бюро ЦК ЛКСМБ рад задач работы ЛКСМБ, асабліва падкрэсліўшы неабходнасць усямернага павышэння класавай пільнасці, рашучага выкрыцця і барацьбы з падонкамі трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыі і другіх контррэвалюцыйных элементаў.

Зробленыя таварышом Гікало ўказанні пакладзены ў аснову работы бюро ЦК ЛКСМБ і надыходзячага пленума ЦК.